ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 259 (331) | Чацвер 14 лістапада 1940 г. | Цана 10 кап.

ЧЫГУНКА СТАЛІНСК — ТАШТАГОЛ

Урадавая камісія прыняла ў эксплаатацыю чыгунку Сталінск-Таштагол з ацэнкай „выдатна". Новая дарога працягласцю ў 105 кіламетраў звязвае Таштаголскі рудник з Кузнецкім металургічным камбінатам. Яна будзе мець вялікае значэнне для гаспадарчага і культурнага развіцця горнай Шоры. (ТАСС).

КРОЎНАЯ СПРАВА БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПАРТЫІ

Два годы таму назад была апублікавана пастанова ЦК ВКП(б) „Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам „Кароткага курса гісторыі ВКП(б)". Выпуск у свет сталінскага падручніка па гісторыі большэвізма і ўказаная пастанова з'явіліся гістарычнай вехай у ідэйным жыцці нашай партыі, совецкага народа. На новую небывалую вышыню ўзнялася работа па ідэйнаму ўзбраенню ўсіх нашых кадраў — што з'яўляецца рашаючай умовай нашых далейшых поспехаў у барацьбе за комунізм.

За прашэдшыя два годы прапаганда марксізма-ленінізма набыла велізарны размах у нашай краіне. І рэволюцыйная тэорыя, якой авалодалі мільёны, стала магутнай матэрыяльнай сілай, рухаючай наперад наша социялістычнае грамадства.

Бясспрэчных поспехаў у справе прапаганды марксізма-ленінізма дабілася і наша абласная партыйная арганізацыя. Больш двух тысяч членаў і кандыдатаў партыі, тысячы комсамольцаў і совецкіх інтэлігентаў вывучаюць „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)"; каля 250 таварышоў па абласці закончылі вывучэнне гісторыі па сярэднему эталону, многія з іх рэгулярна працуюць над асобнымі класічнымі творамі марксізма-ленінізма. „Кароткі курс" стаў настольнай кнігай не толькі для комуністаў, але для многіх сельскіх актывістаў. За 10 месяцаў мінулага года каля 10 тысяч чалавек па абласці набылі ў кнігарнях гэтую выдатную кнігу на беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай мовах. Расце попыт на творы Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна — за ўказаны перыяд кнігарнямі абласці прадана каля 35 тысяч такіх кніг.

Значную дапамогу вывучэнням гісторыі ВКП(б) аказваюць лекцыі. За 10 месяцаў мінулага года па абласці прачытана 360 лекцый, іх праслухала 45 тысяч чалавек. Партыйныя арганізацыі пачалі з поспехам практыкаваць рэкамендаванае пастановай ЦК ВКП(б), наладжванне публічных лекцый з невялікай аплатай. За мінулы год лектарскі ўнікі таксіх лекцый прачытана 25, іх праслухала больш 6 тысяч чалавек.

Асноўным метадам авалодвання марксісцка-ленінскай тэорыяй стала самастойная вучоба. Сотні людзей, якія на працягу многіх год наведвалі заняткі розных гурткоў без належнага эфекту, навучыліся зараз самастойна працаваць над кнігай, паверылі ў свае сілы, атрымалі густ да тэарэтычнай вучобы, якая стала для іх неабходнасцю. Амаль па кожнай партыйнай арганізацыі абласці можна прывесці прыклады таварышоў, якія настойлівай сістэматычнай работай над сабой значна павысілі свой палітычны ўзровень, расшырылі свой кругазор, сталі у сувязі з гэтым многа лепш спраўляцца з даручанай ім сур'ёзнай дзяржаўнай і партыйнай работай.

У Пружанскай партыйнай арганізацыі настойліва працуе вёд павышэнне свайго ўзроўню загадчык арганізацыйна - інструктарскага аддзела райкома партыі т. Шалак. Ён закончыў вывучэнне гісторыі па „Кароткаму курсу" працуе над работамі Леніна і Сталіна, мае надзвычайную ўласную бібліятэку, чытае сістэматычна мастацкую літаратуру. І вось дзе магчымасць т. Шалаку чытаць лекцыі па гісторыі партыі для партыйнага актыву і інтэлігенцыі.

У гэтай - жа партарганізацыі малады член партыі тав. Баранаў прапрацаваў падручнік па гісторыі партыі, зараз працуе над работамі Леніна і Сталіна па нацыянальнаму пытанню, добра працуе ў акасці кіраўніка агітгаманіцтва. Прыняты восной багучага года кандыдатам у члены ВКП(б), комсамолец т. Сінакевіч, паспяхова вывучае гісторыю партыі, сам задае прапагандысцкую работу.

Прыклад большэвіцкіх адносін да партыйнай прапаганды паказвае інструктар Дамачэўскага райкома партыі т. Шостак. Будучы сакратаром партбюро первічнай арганізацыі пры райкоме партыі, т. Шостак сваім асабістым прыкладам і штодзённай работай з комуністамі дабіўся таго, што ўсе 18 комуністаў данай арганізацыі вывучаюць гісторыю партыі.

Але было-б недапушчальнай для большэвікоў памылкай, калі-б партыйныя арганізацыі заспакоіліся на дасягнутым і хоць кой-небудзь меры аслабілі-б увагу да пытанняў партыйнай прапаганды.

Грандыёзныя палітычныя і гаспадарчыя задачы, якія стаяць перад абласной партыйнай арганізацыяй па ўмацаванню органаў совецкай улады, па социялістычнай перабудове гарадоў і вёсак, па комуністычнаму выхаванню мас працоўных катэгарычна патрабуюць значнага павышэння ідэйнай згуртаванасці і палітычнай падкаванасці нашых кадраў.

У святле гэтых задач праведзеная работа, як па яе размаху, так і па якасці, нас зусім не можа задаволіць.

Праверка, праведзеная гарадскім і абласным камітэтамі партыі ў радзе партарганізацый абласці, субяседаванні, праведзеныя сакратарамі райкомаў, гаркома і абкома партыі з радам кіруючых работнікаў паказалі, што частка нашых кіруючых кадраў непарціма слаба працуе над ліквідацыяй сваёй тэаретычнай адсталасці. Ёсць яшчэ ў нас работнікі, якія думаюць пражыць за кошт свайго старога „багажа", які на практыцы аказваецца надзвычайна мізэрным. Не вывелася ў нас людзі, якія хварэюць чуждым большэвізму вузкім дзяляцтвам, не вывелася яшчэ зусім лодыры ад тэорыі.

З гэтым больш мірыцца ніяк нельга!

Наша партыя, вялікі Сталін нам пастаянна напамінаюць: каб не нарабіць сур'ёзных памылак у практычнай рабоце, большэвікі павінны настойна працаваць над узбагачэннем сваіх ведаў, вывучаць гісторыю партыі, яе тэорыю, яе стратэгію і тактыку на розных этапах, авалодаць марксісцкім дыялектычным метадам.

„Гісторыя партыі вучыць, далей, што партыя рабочага класа не можа выканаць роли арганізатара і кіраўніка пролетарскай рэволюцыі, калі яна не авладала перадавой тэорыяй рабочага руху, калі яна не авладала марксісцка-ленінскай тэорыяй" („Кароткі курс гісторыі ВКП(б)", стар. 335).

У сваёй гістарычнай пастанове ад 14 лістапада 1938 года Цэнтральны камітэт абавязаў партыйныя камітэты „сур'ёзна заняцца прапагандай марксізма-ленінізма — кроўнай справай большэвіцкай партыі. Камітэты партыі абавязаны кіраваць справай прапаганды па сутнасці, глыбока ўнікаючы ў яе змест". Гэтым дырэктывам павінна стаць закладзена ў асноў. работы ўсіх партыйных камітэтаў і іх сакратароў.

Наладзіць неаслабны сістэматычны кантроль па сутнасці над палітычнай самаадукацыяй комуністаў, аказваць практычную дапамогу вывучаючым гісторыю партыі, вывучаць і папулярызаваць лепшы вопыт арганізацый і асобных таварышоў, значна павысіць якасць чытаемых лекцый, праводзімых кансультацый, уцягваць у прапагандысцкую работу больш шырокі круг таварышоў, стварачы ўсе ўмовы для плённай работы прапагандыстаў, значна лепш арганізаваць прапаганду марксізма-ленінізма ў комсамоле, сярод розных атрадаў нашай інтэлігенцыі—баявыя задачы кожнай партыйнай арганізацыі.

У абкоме КП(б)Б

Аб правядзенні другой гадавіны з дня пастановы ЦК ВКП(б) „Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам „Кароткага курса гісторыі ВКП(б)"

У азнаменаванне другой гадавіны з дня пастановы ЦК ВКП(б) „Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам „Кароткага курса гісторыі ВКП(б)" бюро абкома КП(б)Б

прапанавала Брэсцкаму ГК і райкомам КП(б)Б правесці да 17 лістапада гэтага года сходы па ўсіх первічных партыйных арганізацыях па пытанню абгаварэння вынікаў выканання пастановы ЦК ВКП(б) „Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам „Кароткага курса гісторыі ВКП(б)" ад 14 лістапада 1938 года і намеціць практычныя мерапрыемствы па паляпшэнню прапагандысцкай работы.

ГК і райкомам КП(б)Б правесці да 25 лістапада нарады закончыўшых самастойнае вывучэнне „Кароткага курса гісторыі ВКП(б)" сумесна з сакратарамі первічных партарганізацый па абмену вопытам работы па вывучэнню асноў марксізма-ленінізма.

Гарком і райкомы КП(б)Б да 26 лістапада павінны праверыць у асобных первічных партарганізацыях становішча партыйнай прапаганды і рэзультаты заслухаць на пасяджэннях ГК і РК КП(б)Б.

Прапанавана абласной газеце „Зара" і раённым газетам выпусціць спецыяльныя нумары газет з шырокім паказам, як выконваецца пастанова ЦК ВКП(б) ад 14 лістапада 1938 года.

Пропускі ў спісах выбаршчыкаў

Ружаны (Па тэлефону). У раёне пры складанні спісаў выбаршчыкаў у асобных месцах адносіліся да гэтай важнейшай работы вяўважліва і безадказна. У выніку гэтага зараз выяўляецца многа пропускаў у спісах выбаршчыкаў.

На выбарчых участках № 1 і 2 (гарадскі пасёлак Ружаны) у спісы не запісана 20 чалавек.

На Лыскаўскім выбарчым участку пры складанні спісаў выбаршчыкаў прапушчана 50 чалавек з вёскі Вільянова. У спісе аказаўся незанесеным выбаршчык Якаў Ждановіч з вёскі Шыбалы. На Варанілавіцкім выбарчым участку ў спісы не занесены выбаршчыкі з вёскі Клепачы Хрыціна і Дзімітрый Гайдук.

Выяўленыя факты пропускаў у спісах выбаршчыкаў абавязваюць кіраўнікоў сельскіх советаў неадкладна заняцца праверкай спісаў выбаршчыкаў і выпраўлення дапушчаных памылак.

В. Крычэўскі.

Сустрэча кандыдата з выбаршчыкамі

Пружаны. (Па тэлефону). 12 лістапада ў прасторнай зале Лукомальскай школы адбылася сустрэча выбаршчыкаў Маліцкай выбарчай акругі № 55 з кандыдатам у дэпутаты Брэсцкага абласнога Совета тав. Жукоўскім Антонам Самёнавічам.

Пасля даклада аб сталінскім блоку комуністаў і беспартыйных у прадстаўчых выбарах у мясцовыя Советы выступіў перад выбаршчыкамі тав. Жукоўскі, які азнаёміў сабраўшыхся са сваім жыццём і дзейнасцю.

Сын рабочага чыгуначніка, член ВКП(б) з 1919 года, доўгі час сам працаваў на чыгунцы, актыўна змагаўся з ворагамі рэволюцыі ў час грамадзянскай вайны. Як прыкладнага рабочага, пасланца чыгункі выдзяляе Жукоўскага ў 1930 годзе на адказную партыйную работу.

У 1939 годзе разам з часцямі Чырвонай Арміі ён прыехаў у Заходняю Беларусь і працуе зараз у горадзе Пружаны старшынёй райвыканкома.

— Самае галоўнае ў жыцці чалавека, — гаворыць тав. Жукоўскі, — гэта заслужыць давер'е народа. Калі працоўныя Маліцкай выбарчай акругі вылучылі мяне кандыдатам у дэпутаты Брэсцкага абласнога Совета, я адчуў вялікую радасць ад усведамлення таго, што я заслужыў у народа давер'е. У сваёй штодзённай практычнай рабоце я пастараюся поўнасцю апраўдаць аказанае мне давер'е.

Пасля азнаямлення з аўтабіяграфічнымі данымі тав. Жукоўскага адзін за другім пачалі выступаць выбаршчыкі.

— Таварыш Жукоўскі, — гаворыць старшыня Лукомальскага сельсовета тав. Краўчук, — многа ўвагі ўдзяляе наладжванню работы сельскіх советаў, чуйна адносіцца да сігналаў працоўных, часта выязджае ў вёскі раёна, на месцы вырашае ўсе ўзнікаючыя пытанні.

Затым выступіў актывіст вёскі Лукомаль тав. Гардзейчык. Ён сказаў:

„У заходніх абласцях Беларусі разгарнулася вялікая палітычная кампанія—выбары ў мясцовыя Советы. Мы павінны выбраць у Советы людзей адданых радзіме, партыі Леніна—Сталіна, здольных апраўдаць давер'е народа. Такой кандыдатурай з'яўляецца тав. Жукоўскі. Працуючы старшынёй Пружанскага РВК, ён здолеў так паставіць работу з совецкім актывам, што раён у ліку першых выканаў план дзяржаўных хлебапаставак і бульбапаставак, закончыў выкананне фінплана".

Таксама выступілі настаўнік Міліповіч, сяляне Шыловіч, Юркевіч, Буздавін, Зесін, Артановіч і іншыя, усяго 11 чалавек. Усе яны горача падтрымалі кандыдатуру тав. Жукоўскага і запэўнілі, што ў дзень выбараў—15 снежня, усе выбаршчыкі Маліцкай выбарчай акругі аддадуць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Ф. Кавалёў.

На акруговай прадвыбарчай нарадзе

Днямі ў Косаве адбылася акруговая прадвыбарчая нарада гарадской і сельскай выбарчых акруг па выборах у абласны Совет дэпутатаў працоўных. Прадстаўнікі працоўных аднадушна падтрымалі вылучэнні кандыдатуры ў абласны Совет т.т. Груздзёва Нікіты Раманавіча — старшыні абласной планавай камісіі і Суханосік Еўдакіі Паўлаўны — калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Варашылава.

Кандыдаты ў дэпутаты абласнога Совета горача дзякавалі калектывы працоўных, якія аказалі ім высокую чэсць і вялікае давер'е, і абавязаліся апраўдаць яго чэсная работай. Потым т. т. Груздзёў і Суханосік расказалі свае аўтабіяграфіі.

— Сын бедняка-беларуса, у мінулым пастух, а затым рабочы, удзельнік грамадзянскай вайны, комуніст з 1919 года, — гаворыць Груздзёў.

У тав. Суханосік актыўнае палітычнае жыццё распачалося зусім надоўга. Усяго год назад жанчына у панскай Польшчы была бяспраўнай. Зусім іншая справа зараз. У вёсцы арганізаваўся калгас. І тут тав. Суханосік паказала сябе перадавой, свядомай жанчынай. Як лепшая стаханоўка, яна была паслана ў Маскву на сельскагаспадарчую выстаўку.

У сваіх выступленнях т. т Мажейка П., Мажейка Ф., Ганчарэня, Чайкун, Шугаёў і іншыя аднадушна падтрымалі кандыдатуры Груздзёва і Суханосік, вылучаныя працоўнымі ў дэпутаты абласнога Совета. Прамоўцы заклікалі даверанных асоб і агітатараў разгарнуць на выбарчых участках шырокую агітацыю за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Пасля нарады для яе ўдзельнікаў быў прадэманстраван кінофільм „Ленін у 1918 годзе".

С. Сурэцова.

Прыбыццё ў Берлін Старшыні Соўнаркома СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў таварыша В. М. Молатава

БЕРЛІН, 12 лістапада. (ТАСС). 11 лістапада вечарам Старшыня Соўнаркома СССР і Народны Камісар Замежных Спраў таварыш Молатаў В. М. праследаў праз пагранічную германскую станцыю Малкіня, дзе яго сустрэлі і віталі прадстаўнікі германскага ўрада ў асобе начальніка пратакольнага аддзела міністэрства замежных спраў Дэрнберга, начальніка штаба сувязі намесніка Гітлера Гесса —Штэнбера і капітана флота Шгафазіуса.

12 лістапада ў 11 гадзін па берлінскаму часу таварыш В. М Молатаў прыбыў у Берлін. Разам з таварышам Молатавым прыбыў паўпрэд СССР у Германіі таварыш Шэварцэў, які выязджаў для сустрэчы таварыша Молатава на совецка-германскую граніцу.

У Берліне таварышу Молатаву германскімі ўладамі была наладжана ўрачыстая сустрэча.

Яшчэ задоўга да прыходу поезда на Ангальцкім вакзале сабраліся прадстаўнікі германскіх урадавых органаў, ваеннага камандавання, дыпламатычнага корпуса ў Берліне, супрацоўнікі совецкага паўпрадства і гандлёвага прадстаўніцтва ў Германіі, замежныя і нямецкія журналісты. Перон вакзала быў упрыгожан зеленню і кветкамі. Ля выхаду з будынка вакзала былі вывешаны совецкі і германскі дзяржаўныя сцягі. На прылягаючых да вокзала вуліцах задоўга да прыходу поезда сабралася вялікая колькасць народу.

Роўна ў 11 гадзін поезд падышоў да перона вакзала. Старшыню Совета Народных Камісараў СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў з германскай стараны сустракалі: міністр замежных спраў Германіі п. фон-Рыбентроп, кіраўнік Вярхоўнага камандавання ўзброеных сіл Германіі генерал-фельдмаршал Кейтэль, кіраўнік германскага працоўнага фронта доктар Лей, начальнік германскай паліцыі Гімлер, начальнік аддзела друку германскага ўрада Дітрых, статс- сакратары міністэрства замежных спраў фон-Вейцзэкер, Боле, Кеплер, пасол Рыттэр, камендант горада Берліна генерал-лейтэнант Зэафэрт, бургамістр Берліна п. Шгэег і іншыя.

Пасля абмену прывітаннямі паміж таварышам Молатавым і п. фон-Рыбентропам, таварыш Молатаў і п. фон-Рыбентроп прайшлі ўздоўж фронта выстраенай ля вакзала роты пачэтнага каравула. Затым таварыш Молатаў у суправаджэнні п. фон-Рыбентропа накіраваўся ў замак Бельвю.

Увесь германскі цэнтральны і правінцыяльны друк аднадушна ацэньвае прыбыццё таварыша Молатава ў Берлін, як факт першаступеннай палітычнай важнасці.

Гутарка паміж п. фон-Рыбентропам і таварышам В. М. Молатавым

БЕРЛІН, 12 лістапада. (ТАСС). Сёння ў 12 гадзін дня па берлінскаму часу адбылася гутарка паміж міністрам замежных спраў Германіі п. фон-Рыбентропам і Старшынёй Совета Народных Камісараў СССР і Народным Камісарам Замежных Спраў таварышом В. М. Молатавым.

Гутарка паміж п. Гітлерам і таварышам В. М. Молатавым

БЕРЛІН, 12 лістапада. (ТАСС). Сёння ў другой палавіне дня ў памяшканні новай імперскай канцылярыі адбылася гутарка паміж рэйхсканцлерам Германіі п. Гітлерам і Старшынёй Совета Народных Камісараў СССР і Народным Камісарам Замежных Спраў таварышом В. М. Молатавым.

Гутарка адбывалася ў прысутнасці германскага міністра замежных спраў п. фон-Рыбентропа і намесніка Народнага Камісара Замежных спраў СССР таварыша В. Г. Дэканазава.

Гутарка працягвалася звыш 2 гадзін.

Кандыдаты ў дэпутаты Маларыцкага раённага совета

Маларыта. (Па тэлефону). Па ўсіх 35 выборчых акругах па выборах у раённы Совет дэпутатаў працоўных закончана рэгістрацыя вылучаных кандыдатаў. Лепшых сваіх сыноў і дочак вылучыў вызвалены народ у раённы совет.

... Сяляне вёскі Боркі, Махранскага сельсовета, вылучылі кандыдатам у дэпутаты раённага совета маладую сялянку - актывістку Аляксандру Ульянаўну Рудзюк. Яна з першых дзён прыхода Чырвонай Арміі прымае актыўны ўдзел у палітычным жыцці вёскі. Яна аказвае вялікую дапамогу сельскому совету ў выкананні ўсіх гаспадарча-палітычных заданняў. Па ініцыятыве Аляксандры Ульянаўны сельсавет адзін з першых у раёне разлічыўся з дзяржавай па здачы ільнонасення і ільновалакна. Па яе ініцыятыве ў вёсцы арганізавана вячэрняя школа па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці.

Хто ў вёсцы Пажэжына, Вялікарыцкага сельсовета, не ведае былога батрака Кузьму Дземянцьевіча Лойка, якога вызваліла з турмы ў верасні 1939 года Рабоча-Селянская Чырвоная Армія. З першых дзён устанаўлення совецкай улады Кузьма Дземянцьевіч прымаў актыўны ўдзел у вылаўліванні белапольскіх афіцэраў. Ён з'яўляўся актыўным агітатарам за совецкую ўладу. Сяляне яго выбралі старшынёй Мацавіцкага сельскага камітэта. З сакавіка 1940 года тав. Лойка працуе старшынёй Мацавіцкага сельсовета. Выбаршчыкі аказалі Кузьму Дземянцьевічу вялікае давер'е, вылучыўшы яго кандыдатам у дэпутаты раённага совета.

Чэснага працаўніка, селяніна-бедняка Івана Карнілавіча Качанку сяляне вёскі Ляхаўцы вылучылі кандыдатам у дэпутаты райсовета. Ён, як і тысячы сялян былой панскай Польшчы, быў эксплаатаваны памешчыкамі і капіталістамі. На сваіх плячах перанёс увесь цяжар капіталістычнага ўціску. Зараз тав. Качанка працуе старшынёй Ляхавіцкага сельсовета.

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Варашылава, Вялікарыцкага сельсовета, вылучылі кандыдатам у дэпутаты райсовета ініцыятара арганізацыі калгаса і яго старшыню Васіля Калініставіча Красько. Калгас імені Варашылава адзін з першых у раёне выканаў сваю першую запаведзь перад дзяржавай — поўнасцю разлічыўся па пастаўках хлеба і ўрадлівы. Тав. Красько з'яўляецца выдатным арганізатарам, карыстаецца вялікім аўтарытэтам у калгаснікаў.

Сабіна Фелікса ўна Ратайчык па нацыянальнасці полька. Былая польская дзяржава з'яўлялася для яе мачыхай. Яна, як і тысячы сялян, усё сваё жыццё працавала на памешчыкаў і асаднікаў, а пад старасць ёй пагражала смерць ад голаду. Сабіна Фелікса ўна непасільнай катаржнай працай на памешчыкаў і асаднікаў падарвала сваё здароўе і асталася інвалідам. Жудоснае будучае чакала яе пры капіталістычным ладзе. Новым, радасным, шчаслівым жыццём зажыла яна з прыходам совецкай улады.

— Гэта мая народная ўлада, — гаворыць Сабіна Фелікса ўна, — і я за яе гатова аддаць усё.

У сваю народную ўладу сяляне вёскі Янувек, Буражскага сельсовета, вылучылі прадстаўніком Сабіну Фелікса ўну Ратайчык.

Прадстаўнікі совецкай інтэлігенцыі, работнікі партыйных і совецкіх арганізацый вылучаны працоўнымі раёна ў раённы Совет дэпутатаў працоўных. Сярод іх фельчар Анна Ацішанаўна Вароніч. За кароткі тэрмін сваёй работы яна зарэкамендавала сябе як чулы і выдатны работнік. Кандыдатамі ў дэпутаты райсовета вылучаны сакратар райкома партыі тав. Каламеец, загадчык райзямаддзела тав. Крыкаценка, загадчык раённага аддзела аховы здароўя тав. Чухман, раённы пракурор тав. Зуб і іншыя.

А. Зарэцкі.

Выстаўка работ Львоўскіх мастакоў у Харкаве

Паміж мастакамі Харкава і Львова ўстанавілася цесная сувязь. У чэрвені гэтага года харкаўчане паслалі ва Львоў альбом сваіх лепшых работ. Цяпер мастакі Львова прыслалі свае творы графічнага маста[illegible] канні Харкаўскай карціннай галерэі імені Шэўчэнка экспанавалі каля 80 работ мастакоў [illegible]

Перадавы нафтатрэст

[illegible] нафты з пачатку года значна павялася. З 9 промыслаў трэста 7 значна перавыконваюць праграму.

Шырэй размах, вышэй якасць партыйнай прапаганды!

Кадры авалодваюць большэвізмам

Другую гадавіну з моманту апублікавання пастановы ЦК ВКП(б) аб пастаноўцы партыйнай прапаганды Жабінкаўская раённая партыйная арганізацыя, як і ўся наша партыя, сустракае поўнымі поспехамі ў справе авалодвання марксізмам-ленінізмам нашымі кадрамі.

Усе члены і кандыдаты партыі нашай арганізацыі вывучаюць гісторыю партыі. Для таварышоў, якія зусім слаба падрыхтаваны, па іх жаданню, створан гурток па вывучэнню гісторыі партыі (па ніжэйшаму звяну). У гуртку займаюцца 12 чалавек, пераважна кандыдаты. Кіруе гуртком штатны прапагандыст райкома тав. Гусеў. Асноўная ж маса комуністаў вывучае самастойна „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)" па сярэднему звяну. 5 чалавек з кіруючага раённага актыва закончылі вывучэнне „Кароткага курса" і працуюць над асобнымі творамі Леніна і Сталіна.

Неабходна адзначыць, што рад таварышоў настойліва працуюць над сабой і дабіліся нядрэнных поспехаў. Работнік райкома партыі тав. Тіванаў працуе над X раздзелам, работае сістэматычна, грунтоўна прапрацоўвае матэрыял, канспектыруе, рэгулярна наведвае лекцыі і кансультацыі, нядрэнна арыентуецца ў гісторыі партыі і ў пытаннях міжнароднага становішча.

Сур'ёзную ўвагу ўдзяляе партыйнай прапагандзе сакратар первічнай партарганізацыі райвыканкома тав. Равінскі. Ён сам вывучае IX раздзел „Кароткага курса", рэгулярна гутарыць з комуністамі, правяраючы па сутнасці, як яны вучацца. Тав. Равінскі нядрэнна спраўляецца са сваёй асноўнай работай, як начальнік райаддзела сувязі, паспяхова кіруе агіткалектывам у Сцебраўскім сельсавеце.

Добра працуюць над авалодваннем гісторыяй большэвіцкай партыі маладыя члены партыі — загадчык райза тав. Ніканаў і народны суддзя—былая батрачка тав. Ровукова.

Райком партыі аказвае паўсядзённую дапамогу таварышам, якія займаюцца палітычнай самаадукацыяй. Сакратар райкома тав Кароткін праводзіць тэарэтычныя субяседаванні з кіруючым партыйным актывам. Сакратары райкома і работнікі аддзела прапаганды і агітацыі правялі з комуністамі 57 індывідуальных гутарак. Пры партыйным кабінеце ёсць 4 кансультанты, зацверджаныя райкомам. Імі дано больш 70 кансультацый па гісторыі ВКП(б), міжнароднаму становішчу, Сталінскай Канстытуцыі. Бібліятэка пры партыйным кабінеце налічвае 2000 кніг, мае 120 чытачоў. У дапамогу вывучаючым гісторыю партыі пры бібліятэцы ёсць рэкамендацыйныя спісы літаратуры па першакрыніцах, а таксама мастацкай літаратуры.

Райком партыі на сваіх пасяджэннях сістэматычна заслухоўвае [illegible] сакратароў первічных [illegible] арганізацый аб вучобе комуністаў. Гатае пытанне перыядычна [illegible] абмяркоўваецца на сходах партыйных [illegible].

Але [illegible] неабходна сказаць, што [illegible] частка нашых таварышоў працуе [illegible] крутымі тэмпамі і таму зусім недастаткова расце, адстаючы ад усё растучых запатрабаванняў мас і складанай абстаноўкі работы. Амаль палавіна партарганізацыі ўсё яшчэ вывучае толькі дакастрычніцкі перыяд гісторыі партыі. Асобныя члены і кандыдаты партыі (Кукулін, Шылаў, Балуха, Ганчароў) працуюць над сабой надзвычайна мала. Можна прывесці і такі факт, што тт. Магер (старшыня райспажыўсаюза) і Чэрноў (упаўнаркамзаг) ужо некалькі месяцаў вывучаюць адзін (VIII) раздзел падручніка. Ясна, што таварышы на працягу гэтага часу проста не вучыліся. Ліквідацыя ўказанага недахопу, павышэнне тэмпаў і якасці вучобы — важнейшая задача нашай партарганізацыі.

Некалькі слоў аб рабоце па ідэйнаму выхаванню інтэлігенцыі. Фактычна за гэтую работу райком узяўся толькі пасля пачатку новага навучальнага года. 9 кастрычніка на пасяджэнні РК было прынята рашэнне аб арганізацыі марксісцка-ленінскага выхавання настаўніцтва. Было зацверджана 8 найбольш падрыхтаваных таварышоў з раённага актыва ў якасці кіраўнікоў прапагандысцкіх семінараў пры сельскіх метадычных аб'яднаннях (пры папоўных сярэдніх школах). На сёнешні дзень амаль усе настаўнікі забяспечаны падручнікамі па гісторыі партыі. Асобныя таварышы добра працуюць на авалоданні большэвізмам. Да такіх адносяцца настаўнікі тт. Якімук, Смецюк, Грамыка Софія, Караткова, Кандрацёнка, Нікіціна, Кавалёва. У дапамогу настаўнікам прачытана тры лекцыі па гісторыі партыі і чатыры лекцыі па міжнароднаму становішчу.

Але трэба прызнаць, што зроблена намі ў гэтым напрамку зусім недастаткова. Абсалютная большасць інтэлігенцыі не пайшла далей вывучэння першага-другога раздзела.

У нашай рабоце па прапагандзе і агітацыі мы вострa адчуваем адсутнасць у раёне кіно, а таксама радыёвузла.

А. Фамічоў,
загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Жабінкаўскага РК КП(б)

На Аршанскім мясакансервным камбінаце (Віцебская обл.). Сакратар партыйнага бюро Т. В. Паўлоўскі (у центры) гутарыць з стахановцамі-комсамольцамі В. Р. Рязьковым (злева) Г. Л. Глушак і К. П. Сычовай, якія выконваюць нормы на 180-150 проц.
Фота М. Савіна — Фотахроніка Белта.

Львоўскі гарком КП(б)У адкрыў вячэрні ўніверсітэт марксізма-ленінізма.
На здымку: выкладчык рускай мовы інстытута Совецкага гандлю О. І. Сцепкоў (злева) і прафесар таго-ж інстытута Г. Мікіцей на лекцыі ў вячэрнім універсітэце.
Фота В. Федасеева. — *Фота ТАСС.*

АБ ПРАПАГАНДЫСЦЕ

У сістэме партыйнай прапаганды асабліва важным звяном з'яўляецца прапагандыст. Ён больш усіх звязваецца з комуністамі па пытаннях іх вучобы, часта гутарыць з імі па тэарэтычных пытаннях, заклікае праз гутаркі, кансультацыі і субяседванні актыўна дапамагаць таварышам разабрацца ў пытаннях гісторыі і палітыкі нашай партыі.

Да прапагандыста партыі зусім законна прад'яўляе асабліва высокія патрабаванні ў сэнсе яго ідэйнай узброенасці; кожны прапагандыст абавязан настойна ўзбагачаць свае веды, павінен прымаць самы актыўны ўдзел у жыцці партыі. Зусім зразумела, што прапагандысту павінны быць створаны неабходныя ўмовы для яго адказнай работы. Гэтыя ўмовы, нажаль, не створаны многім прапагандыстам райкомамі нашай вобласці.

Прапагандыст Сямяніцкага райкома партыі тав. Яцына вядаўна знаходзіцца на такой кіруючай рабоце. Яна заяўляе, што палюбіла гэтую работу, але ніхто ёй не дапамог разабрацца ў абстаноўцы, не праінструктаваў. У результаце работа ў яе ідзе слаба, плана работы няма. Ды, уласна кажучы, як яна можа планіраваць свой час? У верасні яна на працягу 18 дзён была ў сельсавеце ўпаўнаважаным па загатоўках, а ў кастрычніку — на працягу 24 дзён. Сваёй непасрэднай работай яна натуральна не займалася — не правяла ні адной кансультацыі, таварыскага субяседвання. Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Саветы — у самым разгары. Выбарчая кампанія патрабуе ад раённага прапагандыста асабліва інтэнсіўнай работы па дапамозе агітатарам, праверцы якасці агітацыйнай работы. Тав. Яцына не пазнаёмілася з работай хоць-бы аднаго агіткалектыва. І не толькі яна адна.

Справа ў тым, што многія раённыя камітэты партыі і іх сакратары забылі аб прапагандыстах, не ствараюць ім умоў для работы, не кантралююць іх дзейнасць.

Ёсць рад фактаў, якія сігналізуюць аб тым, што некаторыя раённыя прапагандысты, маючыя зусім невысокую палітычную і агульнаадукацыйную падрыхтоўку, недапушчальна слаба працуюць над павышэннем свайго ўзроўню. Прапагандыст Дзвінскага райкома партыі тав. Забаўскі вельмі слаба ведае гісторыю нашай партыі, фактычна не вучыцца. Не чытае ён і мастацкай літаратуры — за ўвесь час прачытаў адну кнігу „Цусіма" — але і аўтара гэтага твора ён не помніць. Ясна, што такі таварыш не зможа застацца на прапагандысцкай рабоце, калі не возьмецца сур'ёзна за вучобу.

Гэты прыклад далёка не адзіны. Ён сведчыць аб тым, што з прапагандыстамі сур'ёзна партыйныя арганізацыі не працуюць.

Трэба сказаць, што і аддзел прапаганды і агітацыі абкома да гэтага часу прапагандыстам належнай увагі не ўдзяляў. Не было праведзена ні адной нарады па абмену вопытам работы. Чамусьці прапагандыстаў не выклікаюць і на абласныя семінары. Абласная газета таксама не арганізавала на сваіх старонках абмену вопытам работы прапагандыстаў.

Партыйныя камітэты павінны ў корані змяніць свае адносіны да справы прапаганды і прапагандыстаў. Неабходна стварыць кожнаму прапагандысту ўмовы для работы, рэзка павысіўшы патрабаванні да іх. Комуністы павінны бачыць у прапагандысце высокаадукаванага, культурнага большэвіка. У кожнага прапагандыста павінен быць свой прадуманы план работы, які прадугледжваў-бы арганізаванае правядзенне таварыскіх субяседванняў, кансультацый, азнаямленне з работай асобных первічных партыйных арганізацый і дапамогу ім у наладжванні партыйнай прапаганды.

Варта рэкамендаваць кожнаму прапагандысту непасрэдна весці тую або іншую прапагандысцкую работу — кіраўніцтва гуртком, агіткалектывам і т. п. Гэта ўзбагаціць яго вопыт і веды.

С. Н. Іофе,
лектар абкома КП(б)Б.

Год самастойнай палітвучобы

Сур'ёзна і сістэматычна вывучаць гісторыю ВКП(б) я пачаў у 1939 годзе. Да гадавіны апублікавання пастановы Цэнтральнага Камітэта партыі аб партыйнай прапагандзе хачу падвесці некаторыя вынікі сваёй самастойнай палітычнай вучобы.

Працаваў я над „Кароткім курсам" так. Раней чым прыступіць да вывучэння таго або іншага раздзела, я падбіраў канспектыўны матэрыял па гэтай тэме з газет і журналаў. Прачытаўшы матэрыял па падручніку і першы дычэрэй літаратуры, прадумваў яго і потым канспектыраваў. Працаваў над кожнай тэмай да таго часу, пакуль для мяне не заставалася нявясных пытанняў. У канспекце звычайна пакідаў месца для наступных запісаў па дадатковай літаратуры.

Глыбока вывучаць марксісцка-ленінскую тэорыю нельга без вывучэння твораў асноваположнікаў комунізма. Я вывучыў творы В. І. Леніна: „Што такое" „прыяцелі народа"і як яны ваюць супроць соцыял-дэмакратаў?," „Што рабіць?", „Крок уперад, два крокі назад", „Дзве тактыкі" і інш., а таксама некаторыя работы Маркса, Энгельса, Сталіна.

Многа часу ў мяне заняло вывучэнне IV раздзела. Але затое я пазнаёміўся з рядам філасофскіх работ, у прыватнасці з поглядамі французскіх матэрыялістаў, XVIII века — Гельвецыя, Гольбаха, Дыдро

Вывучэнне гісторыі партыі дало мне надзвычайна многа для разумення ўсёперамагаючай сілы комунізма., для ўсведамлення законаў грамадскага развіцця, для разумення сучаснасці. Работа над гісторыяй партыі на многа расшырыла мой кругазор, прывіла цягу па тэарэтычнай вучобы, дала мне магчымасць лепш працаваць на давераным мне ўчастку работы.

Зараз я прыступіў да вывучэння работы Плеханава „Да пытання аб развіцці маністы чнага погляду на гісторыю". Буду працаваць таксама над геніяльным творам Леніна „Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм".

Міхаіл Пармон,
комсамолец

У гаркоме КП(б)Б

Бюро Віцебскага гаркома КП(б)Б 11 лістапада заслухала даклад сакратара партарганізацыі гарадской пракуратуры тав. Казакова аб становішчы агітацыйна-масавай работы на Маякоўскім выбарчым участку, да якога гэтая арганізацыя прымацавана.

Бюро гаркома адзначыла, што не гледзячы на тое, што з часу апублікавання Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР прайшоў амаль месяц, агітацыйна-масавая работа сярод жыхароў Маякоўскага выбарчага ўчастка не арганізавана, калектыў агітатараў да гэтага часу не падабран, прыступілі да работы толькі 2 агітатары.

Бюро гаркома абавязала партыйную арганізацыю неадкладна арганізаваць для выбаршчыкаў гурткі па вывучэнню Канстытуцыі і выбарчага закона, шырока прыцягваючы для правядзення агітацыйнай работы таварышоў з мясцовага актыва, зарэкамендаваўшых сябе на практычнай рабоце ў час мінулых выбараў і ў барацьбе за ўмацаванне совецкай улады ў заходніх абласцях. Не радзей аднаго разу ў дэкаду павінны праводзіцца семінары агітатараў для інструктажу і абмену вопытам работы.

Партыйнай арганізацыі даручана распрацаваць план масавых мерапрыемстваў на ўвесь час выбарчай кампаніі, прадугледзеўшы правядзенне агульных сходаў, выпуск насценнай газеты, культурнае абслугоўванне выбаршчыкаў.

5-ці дзённыя курсы агітатараў

Байцы, камандзіры і палітработнікі часці, дзе намеснікам камандзіра па палітычнай часці старшы палітрук тав. Сухарэнка, актыўна і з вялікім уздымам рыхтуюцца да выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Тут распачалася дзейсная агітацыя за кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных у дэпутаты абласнога Совета, слаўнага сына совецкага народа камандзіра-ордэнаносца тав. Чуйкова.

Дням ў часці адбыўся прад выбарчы сход асабовага састава. Удзельнікі сходу падрабязна азнаёміліся з біяграфіяй свайго кандыдата. Выступаўшыя з прамовамі таварышы Асмалоўскі, Гурын, Падгарэцкі і іншыя аднадушна заяўлялі, што яны аддадуць галасы за свайго кандыдата, які з чэсцю і большэвіцкай сумленнасцю апраўдае высокае давер'е выбаршчыкаў.

У прынятай пастанове сход байцоў, камандзіраў і палітработнікаў абавязваецца сустрэць дзень выбараў выдатнымі дасягненнямі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы і 15 снежня ўсім, як аднаму, з'явіцца на выбарчы ўчастак і аднадушна прагаласаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

У часці створаны 5-дзённыя курсы агітатараў, на якіх займаецца 40 чалавек. Агітатарам будуць прачытаны лекцыі: „Канстытуцыі СССР і БССР — самыя дэмакратычныя канстытуцыі ў свеце", „Саветы, як палітычная аснова соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян", „Правы і абавязкі грамадзян СССР", „Соцыялістычная ўласнасць — эканамічная аснова совецкай улады", „Нацыянальная палітыка совецкай улады", „Служба ў РСЧА — пачэсны абавязак грамадзян СССР", „Праца ў СССР — справа чэсці, доблесці і геройства" і „Другая імперыялістычная вайна і знешняя палітыка Совецкага Саюза". Да чытання лекцый прыцягнуты лепшыя прапагандысцкія сілы часці.

Зах. АВА — **П. Б.**

ПАМЯТНЫЯ ДНІ

(ПЯЦІГОДДЗЕ ЎСЕСАЮЗНАЙ НАРАДЫ СТАХАНАЎЦАЎ)

Пяць год таму назад, 14—17 лістапада 1935 года, у сталіцы вялікага Совецкага Саюза — Маскве — адбылася Першая ўсесаюзная нарада стахановцаў прамысловасці і транспарта. Гісторыя гэтай нарады паказвае, як высока пэнящца праца і людзі працы ў соцыялістычнай краіне.

Справа была так.

У ноч з 30 на 31 жніўня 1935 года ў Данбасе, на шахце „Цэнтральная — Ірміно", забойшчык Аляксей Грыгор'евіч Стаханаў устанавіў рэкорд здабычы вугалю. Ён вырубіў за адну змену 102 тоны вугалю. Стаханаў здзівіў здабыў столькі вугалю, колькі, па існуючых тады нормах, павінны былі здабыць 14 забойшчыкаў.

Як дасягнуў гэтага Аляксей Стаханаў?

Раней забойшчык не толькі [illegible] рубаў вугаль, але і крапіў [illegible] шчаную ад вугалю прастору. [illegible] працуе некалькі гадзін адбойным малатком, потым малаток адносіцца ў бок, возьме тапор, лес і [illegible] нае крапіць. Стаханаў прыйшоў да думкі, што калі зрабіць [illegible] вел працы, даручыць забойшчыку толькі вырубаць вугаль, а для краплення выдзеліць другога рабочага — крапільшчыка, то прадукцыйнасць працы рэзка ўзрасце. Ён так і зрабіў. Рэзультат — 14 норм за змену.

Вестка аб дасягненні Стаханава мігам абляцела ўсю Совецкую краіну. У розных галінах народнай гаспадаркі з'явіліся паслядоўнікі Стаханава. Кожны дзень прыносіў краіне радасныя весткі. У горадзе Горкім, на аўтамабільным заводзе, каваль Вусыгін устанавіў рэкорд на коўпы валоў. У Ленінградзе абуўшчык Сметанін перапрагнуў за змену 1400 пар бацінак пры норме 680 пар. У горадзе Вічуге маладыя ткачыхі Дуся і Маруся Вінаградавы распачалі абслугоўваць адразу па 100 ткацкіх станкоў. У Архангельску, на лесапільным заводзе, рамшчык Мусінскі паставіў рэкорд па распілоўцы бярвенняў. На чыгуначным транспарце праславіўся машыніст Крыванос.

Кожны рэкорд выклікаў новы ўздым соцыялістычнага спаборніцтва ў краіне. Распачаўся масавы рух за высокую прадукцыйнасць працы, рух празваны стахановскім па імені яго зачынальніка — Стаханава. Усё гэта адбывалася ў месяцы, напярэдадні святкавання XVIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. На свята ў Маскву былі запрошаны першыя стахановцы: Стаханаў, Вусыгін, Вінаградавы, Дзюканаў, Крыванос, Сметанін — і дзесяткі іншых выдатных рабочых — героў прамысловасці. Сярод гасцей сталіны была вялікая група чыгуначнікаў-ударнікаў.

14 лістапада гасцяўшыя ў Маскве стахановцы былі запрошаны на гутарку з кіраўнікамі большэвіцкай партыі і совецкага ўрада. Днём гутарка распачалася ў Цэнтральным Камітэце ВКП(б), а вечарам нарада была перанесена ў Вялікі Крэмлёўскі палац, дзе сабралося больш трох тысяч выдатных майстроў соцыялістычнай працы.

Вялізарная зала Крэмля, дзе адбываюцца з'езды большэвіцкай партыі і сесіі совецкага парламента — Вярхоўнага Совета СССР — была перапоўнена да краёў. Залу занялі металісты і шахцёры, чыгуначнікі і ткачыхі, электрыкі і кандзіцеры, абуўшчыкі і будаўнікі танкаў, рабочыя папяровых фабрык і сталяры, кавалі і краўцы.

Раздаўся званок, і ўсе позіркі накіраваліся [illegible] стала прэзідыума. Праз не[illegible] таварышы Сталін, Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Арджанікідзе, Калінін, Андрэеў, Мікоян, Жданаў, Хрушчоў.

Доўгія [illegible] стоячы [illegible] і яго саратнікаў. Кожны раз, калі, здавалася, авацыя сціхае, то ў адным, то ў другім канцы велізарнай залы раздавалася гучнае, гарачае прывітанне правадыру; воклічы „ура", падхапліваемыя рукаплясканнямі, сатрасалі своды Крэмлёўскага палаца.

Чатыры дні працавала ў Крэмлі Першая ўсесаюзная нарада стахановцаў. Гэта быў незвычайны з'езд. Тут не было дакладаў. І ў той-жа час кожнае выступленне было дакладам аб стахановскай творчасці ў той альбо іншай галіне прамысловасці. Тут не было оправаздач. У той-жа час у выступленнях кіраўнікоў партыі і ўрада таварышоў Сталіна, Молатава, Варашылава, Орджанікідзе, Кагановіча, Мікояна, Жданава, Хрушчова, Шверніка мрка адлюстроўвалася значэнне пачыну стахановцаў-піянераў для новых перамог соцыялізма.

Чатыры дні, з 14 па 17 лістапада, кіраўнікі партыі і ўрада трымалі нараду з стахановцамі, як рушыць далей соцыялістычную індустрыю, як вырашыць задачу ўсіх задач—дасягнуць такой высокай соцыялістычнай прадукцыйнасці працы, якая [illegible] ступіна капіталістычнаму грамадству.

Кіраўнікі партыі і ўрада [illegible] прамовах высока ацанілі стахановцаў і па [illegible] на іх залітых [illegible] рух яшчэ больш разаўецца. Тав. Молатаў назваў стахановцаў сталінскімі вучнямі.

17 лістапада, калі нарада ўжо падыходзіла да канца, на трыбуну выйшаў таварыш Сталін. Правадыр народа, сустрэты бурнай авацыяй, распачаў сваю гістарычную прамову аб вялікай ролі стахановскага руху.

Таварыш Сталін раней за ўсё заявіў, што стахановскі рух быў бы немыслім без новай тэхнікі. Большэвікі ператварылі Расію ў высока-індустрыяльную краіну, багатую тэхнікай. Совецкія людзі, поўнасцю аўладаўшыя гэтай тэхнікай,—гэта стахановцы. Яны дабіваюцца такой высокай прадукцыйнасці працы, якую можа даць толькі соцыялізм і не можа даць капіталізм.

Таварыш Сталін указаў на прычыны хуткага распаўсюджвання стахановскага руху па ўсёй краіне. Асновай стахановскага руху паслужыла раней за ўсё карэннае палепшанне матэрыяльнага становішча рабочых. „Жыць стала лепш, таварышы. Жыць стала весялей. А калі весёла жыцца, работа спорыцца. Так [illegible] таварыш Сталін. Так думал[illegible] стахановцы.

Другая [illegible] стахановскага [illegible] ў СССР няма [illegible] няма эксплуататараў [illegible] славекам. „Людзі ў нас не на эксплуатацыю [illegible] абагачэння тунеядцаў, [illegible] свой клас [illegible] совецкае грамадства, дзе ва ўладзе стаяць лепшыя людзі рабочага класа. Пагэтаму праца мае ў нас грамадскае значэнне, яна з'яўляецца справай чэсці і славы".

Таварыш Сталін тут-жа растлумачыў велізарную розніцу паміж працай пры капіталізме і соцыялізме. У капіталістычным грамадстве праца мае прыватны, асабісты характар. "Ніхто цябе не ведае і ведаць не хоча. Ты працуеш на капіталістаў, ты іх абагачаеш? А як-жа інакш? Для таго цябе і нанялі, каб ты абагачаў эксплуататараў. Ты не згодзен з гэтым, ідзі ў шэрагі беспрацоўных і гібей, як ведаеш. — знойдзем другіх больш згаворчывых. Пагэтаму праца людзей невысока пэнящца пры капіталізме. Зразумела, што ў такіх умовах стахановскаму руху на можа быць месца. Іншая справа — ва ўмовах совецкага ладу. Тут працоўны чалавек у чэсці. Тут ён працуе не на эксплуататараў, а на сябе, на свой клас, на грамадства. Тут працоўны чалавек не можа адчуваць сябе закінутым і адзінокім. Наадварот, працоўны чалавек адчувае сябе ў нас свабодным грамадзянінам сваёй краіны, свайго рода грамадскім дзеячом. І калі ён працуе добра і дае грамадству тое, што можа даць, — ён герой працы, ён авеян славай. Зразумела, што толькі ў такіх умовах мог нарадзіцца стахановскі рух".

Таварыш Сталін разгледзеў у

Дзіцячая мастацкая самадзейнасць

У дні святкавання XXIII гадавіны Кастрычніка ў гарадскім тэатры адбыўся ўрачысты раніштік, прысвечаны адкрыццю абласнога Дома піонераў і школьнікаў. Пасля ўрачыстай часткі была паказана п'еса Валянціна Катаева „Белеет парус одинокий" у выкананні дзіцячага драматычнага гуртка абласнога Дома піонераў і школьнікаў.

Хочацца сказаць некалькі слоў аб гэтым спектаклі. Перш за ўсё спектакль трэба расцэньваць як вялікае дасягненне ў рабоце зусім нядаўна існуючага Дома піонераў і школьнікаў. Драматычны гурток арганізаваўся два месяцы назад, а над п'есай працаваў паўтара месяца. Тэрмін для любіцельскага і тым больш дзіцячага гуртка зусім невялікі. Кіраўніку гуртка тав. Квіцінскаму ва гэты тэрмін удалося згуртаваць дружны калектыў, які сур'ёзна і з любоўю адносіцца да работы.

П'еса Валянціна Катаева гаворыць нам аб гераічных днях 1905 г. Героем п'есы з'яўляецца матрос Жукаў, удзельнік рэвалюцыйнага паўстання матросаў на браняносцы „Пацёмкіне". Паўстанне было падаўлена, але яно прагучала магутным заклікам да барацьбы супроць прыгнечання і самаўладства. Гераічная каманда браняносца была часткай расстрэлена, часткай пасаджана ў турмы і толькі адзінкам удалося выратавацца ад арышту. Герой п'есы — матрос Жукаў, большавік, якому ўдалося пры дапамозе сваіх таварышоў—рабочых і рыбакоў, — уйсці ад палічы. Ён кіруе рабочай дэманстрацыяй у прыморскім горадзе і зноў падвяргаецца праследаванню паліцыі. Яго заключаюць у турму, але ён уцякае з яе. У канцы п'есы Жукаў ап'язджае з горада. Уперадзе яго чакае такая-ж упартая і суровая барацьба за свабоду працоўных.

Жукаў—чалавек баявога і суровага закала, вялікай смеласці і стойкасці. На вялікі жаль, у спектаклі гэты вобраз, а таксама вобразы іншых комуністаў Царэнція і Софіі Барысаўны, недастаткова яркія, не прыцягваюць асноўнай увагі гледача. А ад гэтага п'еса набывае некалькі знадворна-авантурны характар.

Мы, зразумела, не прад'яўляем да дзіцячага выканання патрабаванняў, якія па сіле толькі прафесіянальным акторам. Але неабходна было рэжысёру звярнуць больш увагі на выкананне ролі Жукава, каб падкрэсліць гэты вобраз.

Лепш удалося ролі хлопчыкаў (Гаўрыла выконваў Лешчынскі і Пеці выконваў Салавей), якія дапамагаюць комуністам у гэтыя гарачыя дні. Ролі ўдачны і таму, што іграць сваіх сверстнікаў дзецям значна лягчэй. Ролі ідуць жыва, кожнае пазўленне хлопчыкаў на сцэне сустракаецца гледачамі з вялікім ажыўленнем. Выкананне гэтых ролей запамнае сабой фігуры комуністаў Жукава і Царэнція. Добра выканаў таксама роль дзеда Гаўрыка — вучань Дзянісаў.

Кіраўнік драматычнага гуртка тав. Квіцінскі здолеў прывіць дзецям сур'ёзныя адносіны да работы над п'есай, дасягнуў добрай дысцыпліраванасці ў гуртку. Гэта вялікае дасягненне. Але трэба сказаць, што спектакль мог быць значна яснейшым і цікавейшым, калі-б тав. Квіцінскі не захапіўся ўвядзеннем усякага роду „рэжысёрскіх трукаў". У яго наглядаецца тэндэнцыя ўвесь час даць так званы „настрой" у спектаклі. Прычым, настрой гэты якісьці мінорны, часам супярэчлівы агульнаму аптымістычнаму гучанню п'есы. Адсюль, відавочна, ідзе злоўжыванне цвятнымі пражэктарамі, ад чаго ўвесь спектакль ідзе ў поўцемры. Гэтым, відавочна, можна растлумачыць і пазўленне бурлакоў з песняй „Дубінушка" у пачатку шостай карціны, малітва Пеці на мосціку ў чацвертай карціне і інш. Унясенне ў спектакль гэтых непатрэбных, зусім нелагічных дэталей толькі заблытвае і перагружае дзеянне.

Найдала рэжысёрскі вырашана і апошняя карціна развітання Жукава. Жукаў едзе для далейшага працягвання барацьбы. Тут, у горадзе, застаюцца яго таварышы. Акрамя лірыкі развітання, павінны былі гучаць і матывы бадзёрасці. А Жукава праводзіць доўгі плач дзяўчынкі, сіні паўзмрок, ды яшчэ пазўленне сышчыкаў, якія вось, вось схопяць Царэнція.

Настрой такі, як быццам усё загінула.

Трэба спадзявацца, што ў далейшай сваёй рабоце гурток, улічыўшы недахопы першай сваёй пастаноўкі, дасць больш дадатныя рэзультаты.

* * *

У другім адзяленні канцэрта выступаў з вялікім поспехам харавы ансамбль Дома піонераў і школьнікаў пад кіраўніцтвам Власава. Гэты хор можа служыць прыкладам для гурткоў мастацкай самадзейнасці дарослых. Працуе ён вельмі малы адрэзак часу, але не гледзячы на гэта, у яго рабоце дасягнуты вялікія поспехі. На канцэрт гурток вынес складаны рэпертуар, як „Песня аб Сталіне" — музыка Палонскага, „Песня Чырвоных палкоў" — музыка Любана, „Арлёнак" —музыка Белага, і вельмі добра справіўся з выкананнем гэтых музычных твораў.

Першыя рэзультаты работы гурткоў абласнога Дома піонераў і школьнікаў добрыя. Кіраўнікі гурткоў Квіцінскі і Власаў паклалі многа сіл на арганізацыю работ і дабіліся поўнай іх зацікаўленасці да мастацкай самадзейнасці. Няма сумнення, што пасля першага паказу сваёй работы гурткі набудуць дзесяткі новых удзельнікаў мастацкай самадзейнасці з ліку гледачоў — школьнікаў і з кожным днём будуць удасканальваць сваё майстэрства.

Чэрэмухіна.

Параход „Чкалаў" знят з мелі

На Каспійскім моры бушаваў шторм. Аграмадныя хвалі падхапілі грузавы параход „Чкалаў" і выкінулі яго на мель. Некалькі дзён работалі эпронаўцы над выратаваннем судна. Самаадданая праца ўвенчалася поспехам. У Галоўным Упраўленні Экспедыцыі Падводных Работ Асобага Назначэння (ЭПРОН) атрымана паведамленне аб тым, што карабель знят з мелі і ў суправаджэнні выратоўчага буксіра сваім ходам адпраўляецца ў горад Махач-Кала.

(ТАСС).

Па гарадах Совецкага Саюза.
Будынак заводакіраўніцтва Магнітагорскага металургічнага камбіната імені Сталіна.

Фота В. Георгіева. *Фота ТАСС.*

Вывучаць беларускую мову*)

На працягу ўсёй гісторыі беларускі народ змагаўся за сваё соцыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Ён змагаўся за развіццё сваёй культуры, сваёй мовы. Беларускі народ у мінулым, не гледзячы на багацце сваёй культуры, не мог атрымаць права і магчымасці на яе развіццё. Ён прыгнечваўся, яго мовай пагарджалі; прымусова або русіфікавалі, або паланізіравалі. Ён не меў права выказваць свае думы і пачуцці на сваёй роднай мове.

„Беларускую мову трымалі ў загоне, каб народ не пазбыў нематы і бяды". (З „Пісьма вялікаму Сталіну").

Толькі Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя вызваліла навекі беларускі народ ад „нематы і бяды" і адкрыла ўсе магчымасці для поўнага росквіту беларускай культуры. Беларуская мова стала дзяржаўнай мовай, як і сама Беларусь стала дзяржавай. Створаны усе ўмовы да адраджэння беларускай культуры і далейшага яе развіцця. „Даступнымі сталі нам Пушкін і Гейне, Руставелі і Горкі, Бальзак і Талстой" (З „Пісьма").

Найлепшыя літаратурныя помнікі, навуковыя творы Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна сталі даступнымі для народа, бо ён іх атрымаў на роднай мове.

„З намі гэтай мовай гаворыць сёння Марко і Энгельс і ты правадыр" (З „Пісьма").

Дзякуючы правядзенню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы беларуская культура расцвіла. Мы маем сваіх выдатных пісьменнікаў. Каму невядомы Купала і Колас? Гэтыя імёны ўвайшлі не толькі ў беларускую нацыянальную літаратуру, але, як найлепшыя пісьменнікі, у совецкую літаратуру.

Мы маем сваіх выдатных мастакоў, кампазітараў. Багата наша беларуская культура. Беларускаму народу прыйшлося правесці рашучы бой з нацдэмамі, якія імкнуліся адарваць беларускую культуру ад культуры вялікага рускага народа. Прыйшлося правесці барацьбу за ачыстку яе ад непатрэбных паланізмаў, архаізмаў і іншых элементаў, якія засмечвалі яе.

„Мы расцілі яе клапатліва, надзейна,

За яе правялі мы з нацдэмамі бой", — заўважае беларускі народ.

У Заходняй Беларусі пад гнётам белапанскай Польшчы, беларускі рабочы і беларускі селянін вымушаны былі цурацца сваёй роднай мовы. Пад гнётам гвалтоўнай паланізацыі беларускі народ пазбаўлен быў сваёй культуры.

Толькі зараз, пры совецкай уладзе, беларускі народ атрымаў магчымасць гаварыць на сваёй роднай мове, будаваць сваю на цыянальную па форме і соцыялістычную па зместу культуру.

На вялікі жаль Брэсцкім гарадскім аддзелам народнай асветы мала зроблена, каб паказаць вызваленаму беларускаму народу велізарнейшы рост беларускай культуры за годы совецкай улады. Працоўныя горада не праслухалі амаль ніводнай лекцыі на беларускай мове.

У кастрычніку месяцы беларускі народ адзначаў 30-годдзе літаратурнай дзейнасці пісьменніка-ордэнаносца З. Бядулі, у лістападзе-снежні адзначае 35-гадовы юбілей літаратурнай творчасці ордэнаносца, народнага паэта рэспублікі Я. Купалы. Але працоўныя горада Брэста не маюць магчымасці праслухаць лекцыю аб іх творчасці.

У горадзе маюцца дзве беларускія школы № 11 і № 8 (Валынка), але настаўніцкімі сіламі яны ўкамплектаваны нядбала. У школе № 11 большасць настаўнікаў праводзяць выкладанне на рускай мове, некаторыя з настаўнікаў гэтых школ зусім не ведаюць беларускай мовы. Вучань слухае ў школе беларускую мову толькі на ўроках беларускай мовы.

Мы маем у горадзе многа настаўнікаў, якія нядрэнна вывучылі беларускую мову (настаўнік 11 НСШ Весман, настаўнікі 5 СШ Марчук, Гейрах, настаўніца 6 НСШ Марчук). Многа працуе над сабою па авалоданню беларускай мовай настаўніца 8 польскай пачатковай школы Камінская. Трэба адзначыць дырэктара 8 НСШ (Валынка) тав. Сімановіча, які не гледзячы на няўдалае ўкамплектаванне школы кадрамі ўсё-ж настойліва патрабуе авалодвання беларускай мовай настаўнікамі і ўжо дабіўся значных зрухаў.

Наркомаветы прапанаваў усім настаўнікам, хто працуе ў нацыянальных школах, авалодаць на працягу 3 месяцаў мовай выкладання. Гэта ўпаўне магчыма, патрэбна толькі адно — жаданне. Людзям, не жадаючым бачыць перспектывы развіцця беларускай мовы і мовы іншых нацыянальнасцей, трэба напомніць словы таварыша Сталіна:

„Можа паказацца дзіўным, што мы, абаронцы зліяння ў будучым нацыянальных культур у адну агульную (і па форме і па зместу) культуру, з адной агульнай мовай з'яўляемся разам з тым абаронцамі росквіту нацыянальных культур у даны момант, у перыяд дыктатуры пролетарыята. Але ў гэтым няма нічога дзіўнага. Трэба даць нацыянальным культурам развіцца і разгарнуцца, выявіўшы ўсе свае патэнцыі, каб стварыць умовы для зліцця іх у адну агульную культуру з адной агульнай мовай" (І. Сталін, „Марксізм і нацыянальна - каланіяльнае пытанне", стар. 350).

Адсюль і следуе неабходнасць узмацнення работы па авалоданню беларускай мовай. Гарадскому аддзелу народнай асветы ў першую чаргу патрэбна многа зрабіць, каб дапамагчы працоўным Брэста даведацца аб багацці беларускай культуры, дапамагчы настаўнікам горада і ўсім працоўным авалодаць багатай беларускай мовай.

Н. Рабоўскі.

*) Розгук на артыкул „За авалоданне

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

НАШЫ КАМАНДЗІРЫ

Калі ў мінулым годзе Чырвоная Армія перайшла граніцу былой панскай Польшчы, то першым яе палонным аказаўся капрал Хобар. Гісторыя Хобара між іншым цікава тым, што яму спатрэбілася 17 год службы ў польскай арміі, каб стаць капралам. У гэтым няма нічога дзіўнага. Хобар быў хоць і паляк, але з беднай сям'і, а пагэтаму і не мог разлічваць нават на сяржанскія нашыўкі.

У іншых умовах і па-другому растуць камандзіры Чырвонай Арміі. Было-б жаданне да працы, да вучобы і чалавек — грамадзянін краіны Совецкаў — мае магчымасць на павышэнне.

Родаслоўная Аляксандра Захарава звязана з ножніцамі і ніткамі. Яго бацька быў краўцом. Па гэтай-жа лініі пайшоў і Аляксандр. У 1935 годзе яго прызвалі ў Чырвоную Армію. Праз год ён скончыў палкавую школу. Спачатку камандаваў аддзяленнем, затым стаў памочнікам камандзіра взвода. Армейскае жыццё палюбіў усёй душой. Зараз тав. Захараў малодшы лейтэнант.

Падраздзяленне, якім даручылі камандаваць тав. Захараву, было сфарміравана пазней усіх. Але гэта не перашкаджала камандзіру імкнуцца за першынства. Аднойчы адзін з камандзіраў падраздзялення — претэндэнт на першынства ў спаборніцтве — прапанаваў яму заключыць соцыялістычны дагавор. Тав. Захараў выклік прыняў. У выніку спаборніцтва яго падраздзяленне выйшла на першае месца за ўсёй часці.

Перамога гэта была забяспечана тым, што ўся работа выходзіла з патрабаванняў работаць лепш, яшчэ больш арганізавана.

У першыя дні прыбыцця ў падраздзяленне многія курсанты былі незадаволены патрабавальнасцю камандзіра, некаторыя з іх прасілі аб пераводзе ў другое падраздзяленне. Але гэта было толькі ў першы час. Хутка курсанты ўбачылі, што патрабавальнасць камандзіра спалучаецца з веданнем справы, з клопатамі аб людзях. І калі яны ішлі на іспыты, ніхто не хваляваўся: веды іх былі трывалы.

Пісьменнік-рэволюцыянер А. Купрын так апісаў ротнага камандзіра царскай арміі Оліву.

— „Ц[illegible] усе свае жыццё суро[illegible] служэбовую лямку, [illegible] ён не прачытаў ні адной кн[illegible], ні а[illegible]ой газеты. Усякімі забавамі, [illegible]італт танцаў, любіцельскіх с[illegible]ектаклей і т. п. ён пагарджаў [illegible]ёй сваёй загрубелай душой, і не было такіх дрэнных і брудных выражэнняў, якія ён не прыкладаў-бы да іх з свайго салдацкага лексікона. Расказваюць пра яго — і гэта магло быць праўдай, — што ў адну цудоўную веснавую ноч, калі ён сядзеў ля адчыненага акна і праваў ротную справаздачнасць, у кустах побач з ім запеў салавей. Сліва паслухаў, паслухаў і раптам крыкнуў дзяцішчыку:

— З-захарчукі Прагані гэту птушку камнем. Перашкаджае.

Гэты вялы, апусцілўшыйся на выгляд чалавек быў страшэнна суроў з салдатамі і не толькі пазваляў біць унцерафіцэрам, але і сам біў жорстка да крыві, да таго, што правініўшыйся падаў з ног пад яго ўдарамі".

Як далёк наш совецкі камандзір ад ротнага камандзіра царскай арміі Оліві! Камандзіры Чырвонай Арміі — усебакова развітыя людзі, жывучыя поўнакроўным і культурным жыццём. Малодшы лейтэнант Захараў вядзе вялікую грамадскую работу, рэгулярна чытае мастацкую літаратуру, упарта работае над павышэннем сваёго агульна-адукацыйнага ўзроўню.

Другі лейтэнант той-жа часці тав Мельнікаў самастойна вывучыў нямецкую, грузінскую, казахскую мовы.

Наш камандзір і чырвонаармеец неадлучны друг ад друга. Яны — сыны аднаго народа. Аўтарытэт камандзіра Чырвонай Арміі трымаецца на павазе яго, як чалавека, аблічоннага высокім давер'ем партыі і ўрада.

У час баявых дзеянняў у адной з часцей Чырвонай Арміі быў наступны эпізод.

...Рота рушылася ў наступленне. І вось — крывавая схватка. Чырвонаармеец Болатаў убачыў: камандзір адбіваўся ад трох непрыяцельскіх салдат, чацверты краўся да яго ззаду. Ні секунды на разважанні Болатаў прыгнуў да камандзіра і прыкрыў яго сваёй груддзю. Удар нажом, прад[illegible]назначаны палітруку, прыняў на сябе чырвонаармеец. Атака працягвалася. Ворагі былі знішчаны ўсе да аднаго.

Болатаў быў небяспечна ранен. Выратаваць магло толькі пераліванне крыві. Камандзір, не хістаючыся, даў яму сваю кроў і Болатоў быў выратаваны.

Байцы Чырвонай Арміі любяць, паважаюць сваіх камандзіраў. У іх асобе яны бачаць волевых кіраўнікоў, умелых весці перамогу.

С. Алёшын,
малодшы палітрук.

Зах. АВА.

Выдатнае папаўненне

Чырвонаармеец Маркаў прывёў двух таварышоў у цывільнай вопратцы. На карыдоры яго сустрэў памочнік начальніка штаба.

— Тав. помначштаба! Я прывёў двух маладых чывонаармейцаў,— звярнуўся чырвонаармеец Маркаў.

—Дзе-ж іх чамаданы?—пацікавіўся помначштаба.

— Я іх прыняў па дарозе і пакінуў у казарме. І тав. Маркаў расказаў як было.

— Я і палітрук тав. Мухін толькі вышлі з казармы на дарогу, накіроўваючыся ў штаб. Нас акліканулі: „Дазвольце даведацца, дзе такая-то часць". Спыніліся. Іх было двое: адзін невялікага росту, круглаліцы; другі—вышэй сярэдняга росту з белым тварам. Яны дасталі з бумажніка ліцер, а таксама накіраванне ваенкамата. Мы адказалі, што яны папалі па месцу прызначэння. Яны дружаскі ўсміхнуліся: „Добра, калі да вас". Тады я ім напомніў, што іх рэчы магчыма пакінуць у казарме. Палітрук згадзіўся і рэчы былі прыняты, а іх я прывёў сюды.

Помначштаба ўзяў іх дакументы, распытаў аб ранейшай рабоце, аб часе праведзеным у пуці. Абодва яны аказаліся інжынерамі. Пасля таго, як дакументы былі ўзяты і закончана гутарка, помначштаба загадаў чырвонаармейцу Маркаву накарміць новых байцоў і завесці ў лазню.

—Ёсць, накарміць і памыць у лазні,—адказаў чывонаармеец Маркаў, чоткa павярнуўшыся да дзвярэй. За ім выйшлі маладыя байцы, ласкава развітаўшыся. Каля маладога папаўнення сабралося многа байцоў.

У гэты дзень у часць прыбыла яшчэ некалькі чалавек. Усе яны з вышэйшай адукацыяй—інжынеры. Сярод прыбыўшых многа членаў партыі і комсамольцаў, маючых па два-тры абаронных значкі.

Ветліва і цёпла былі прыняты маладыя байцы камандаваннем часці—чырвонаармейцамі, камандзірамі і палітработнікамі.

П. Буслаў.

Зах. АВА.



Новая гоначная машына „ГЛ—1", вытворчасці Горкаўскага аўтазавода імені Молатава (канструктар С. В. Агітаў). На папярэдніх выпрабаваннях гэта машына дасягнула хуткасці 150 клм. у гадзіну.

Фота П. Вазнясенскага. *Фота ТАСС.*

стаханаўскім руху расткі комунізма.

Пры комунізме кожны працуе па здольнасцях, а атрымоўвае па патрэбнасцях. Каб грамадства магло цалкам і поўнасцю задаволіць патрэбнасці сваіх грамадзян, у ім павінна быць ізабілле прадметаў спажывання, а гэтага ізабілля можна дасягнуць толькі на аснове высокай прадукцыйнасці працы. Стаханаўскі рух і ёсць рух за соцыялістычную прадукцыйнасць працы, не даступную ў капіталістычным грамадстве.

У комуністычным грамадстве не будзе існаваць процілегласці паміж разумовай і фізічнай працай. Знішчэнне гэтай процілегласці можна дасягнуць на аснове ўзыму культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочага класа да ўзроўню работнікаў інжынерна-тэхнічнай працы. Высокая ступень авалодання тэхнікай, дасягнутая стаханаўцамі, паказвае, што стаханаўскі рух змяшчае ў сабе першыя пачаткі такога культурна-тэхнічнага ўзыму рабочага класа.

Таварыш Сталін з геніяльнай праворлівасцю прадбачыў магутнае развіццё стаханаўскага руху. „Сёння стаханаўцаў яшчэ мала, але хто можа сумнявацца, што заўтра іх будзе ў дзесяць разоў больш"? — гаварыў таварыш Сталін.

За пяць год стаханаўскі [illegible] абагаціўся новымі формамі. З'явіліся стаханаўцы многастаночнікі (людзі, якія пераходзяць на адначасовае абслугоўванне некалькіх станкоў. З'явіліся стаханаўцы — сумяшчальнікі прафесій (людзі, якія адначасова выконваюць работу сменнай прафесіі і дазваляюць пагэтаму з меншым лікам работнікаў выпускаць больш прадукцыі). Накапіўся ўжо вопыт калектыўнай стаханаўскай работы, калі не адны толькі адзіночкі, а цэлыя брыгады і цэхі дасягаюць высокай прадукцыйнасці працы.

Сіла стаханаўскага руху — у яго масавасці. Ва ўсіх раёнах СССР спаборнічаюць не толькі стаханаўцы прамысловасці, але і стаханаўцы калгасаў.

Зараз ужо выраслі стаханаўцы, якія на многа перакрылі дасягненні першых стаханаўцаў.

Зусім нядаўна совецкая краіна стала сведкай бурнага развіцця стаханаўскага руху ў жалезнарудным басейне Крывароржа (Украіна). Крывароржа корміць рудой гіганцкія металургічныя заводы поўдня нашай краіны. Крывароржа адставала, не выконвала плана, давала руды менш, чым патрэбна; [illegible] гэтага металургічныя заводы [illegible] і вялікія цяжкасці.

Але вось нядаўна [illegible] прагрымеў сваімі [illegible] крыварожкі буршч[illegible] Сямёнолас. Ён прапа[illegible] метад бурэння, які дазваляе паскорыць у некалькі разоў здабычу руды. У Сямёноласа адразу з'явілася многа паслядоўцаў, бо ў Совецкім Саюзе добрыя рабочыя не трымаюць пры сабе сакрэтаў вытворчасці. Наадварот, Сямёнолас расказаў і паказаў усім, як трэба працаваць скарасными метадамі, каб совецкая радзіма не мела патрэбы ў рудзе. І што-ж? Шахта за шахтай стала выконваць, а затым і перавыконваць план. Патокі руды пацяклі з Крыва рожжа на металургічныя заводы. Яны не толькі задаволілі свае патрэбы ў рудзе, але і стварылі неабходныя на зіму запасы. Выплаўка чыгуна павялічылася і працягвае расці.

Больш таго. Калі аб метадах, аб прыёмах работы Аляксея Сямёноласа даведаліся шахцёры вугальнага басейна — Данбаса, — яны рашылі выпрабаваць скарасныя метады пры здабычы вугалю. Шахцёр Нікалай Краўцоў даказаў, што і вугаль можна здабываць хутчэй.

Так у совецкай краіне добрае пачынанне аднаго работніка хутка становіцца дастаяннем тысяч і дзесяткаў тысяч людзей, дастаяннем усяго грамадства. Гэта магчыма толькі ў СССР, толькі ў краіне соцыялізма, дзе людзі жывуць і працуюць у цесным са[illegible]ружастве, на благо ўсяго [illegible]

Ленінград. Рускі музей.
Фота Р. Мазелева і Э. Хайкіна. *Фота ТАСС*

Улічыць сур'ёзныя недахопы

12 лістапада ў Брэсцкім Доме партыйнай асветы адбылася гарадская нарада сакратароў первічных партыйных арганізацый і даверных па выбарчых участках. Даклад на нарадзе аб ролі і месцы партыйных арганізацый і даверных у галіне разгортвання агітацыйна-масавай і арганізацыйнай работы па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных абіў сакратар ГК КП(б)Б тав. Васеўскі. У сваім дакладзе ён падрабязна спыніўся на значэнні выбараў і на той рабоце, якую неабходна зараз праводзіць.

— Да агітацыйна-масавай работы на ўчастках і ў округах, — гаворыць тав. Красоўскі, — мы павінны прыцягнуць шырокія масы працоўных, зарэкамендаваўшых сябе са станоўчага боку час выбараў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі і ў Верхоўныя Саветы СССР і БССР. Задача — арганізаваць масавую работу так, каб да глыбокай свядомасці кожнага працоўнага давесці выбарчы закон і Канстытуцыю нашай рэспублікі, падрабязна азнаёміць працоўнага з кандыдатамі, з іх жыццёвым шляхам, з палітычнай і вытворчай актыўнасцю. Кожнаму з нас трэба добра ведаць, што класавы враг будзе ўсякімі метадамі і формамі дзейнічаць, каб пашкодзіць паспяховаму ходу выбарчай кампаніі. Задача — паставіць усю нашу работу так, каб даваць своечасовы і рашучы адпор варожым выбанням.

Далей тав. Красоўскі спынуўся на становішчы масавай работы серод выбаршчыкаў. З дакладу і выступленняў магчыма зрабіць вывад, што значная колькасць первічных партыйных арганізацый пакуль слаба праводзіць масавую работу сярод працоўных. Партыйныя арганізацыі кандуктарскага дэпо чыгуначнага вузла ніяк не падабрала патрэбнай колькасці агітатараў для работы на сваім участку. І гурткі па вывучэнню выбарчага закона і Канстытуцыі не работаюць. Сакратар первічнай арганізацыі тав. Малчанаў не арганізаваў гэтую важнейшую справу, ён зведаў на самацёк. Факт таго, каб на нарадзе расказаць, што марыць рабіць на сваёй участку партарганізацыя, Малчанаў ударыўся ў другую крайнасць, абмежаваўся дасяткам аб'ектыўных прычын апраўдаць сваю неаператыўнасць і безініцыятыўнасць.

Камуністы партарганізацыі аддзела (сакратар тав. Крапіўка) не ведаюць свайго ўчастка.

Слаба арганізуюць работу па выбарах партыйныя арганізацыі лесдрэўімсаюза і водачнага завода. На ўчастках, да якіх прымацаваны гэтыя арганізацыі, распачала работу незначная колькасць агітатараў і то з вялікім спазненнем.

На нарадзе прыводзіліся факты абыякавых адносін да складання спісаў выбаршчыкаў. Асабліва многа блытаніны выяўлена ў спісах выбаршчыкаў на Маякоўскім выбарчым участку. У грамадзяніна Саладухі Івана Максімавіча не ўказан год нараджэння. Некаторым выбаршчыкам зроблена павелічэнне на 20, 30 нават 100 год. Вельмі марудна абстаіць справа з абталяваннем участкаў. Большасць з іх не мае лозунгаў, плакатаў, партрэтаў правадыроў партыі і ўрада. Па свайму знадворнаму і ўнутранаму выгляду яны не прыцягваюць выбаршчыка, не з'яўляюцца цэнтрам агітацыйна-масавай работы.

Выступаючыя жорстка крытыкавалі гарадскі выканаўчы камітэт за слабае кіраўніцтва работай па складанню спісаў выбаршчыкаў і па абталяванню участкаў. Па віне гарадскога выканаўчага камітэта значная колькасць працоўных не ўключана ў спісы выбаршчыкаў, асобныя камісіі не маюць памяшканняў пад у[illegible]

Значнае месца на [illegible] было ўдзелена роль [illegible] на ўчастку [illegible] цэнтральная [illegible] работы ў ма[illegible] будаваць сваю работу, так, [illegible] выбаршчык [illegible] кандыдата. Уся ма[illegible] работа на ўчастку павінна [illegible] накіравана на ўзвышэ палітычны і вытворчай актыўнасці працоўных, на лепшае большае ўмацаванне інтэрнацыянальнай дружбы.

У сваім выступленні сакратар ГК КП(б)Б тав. Карагіоў падрабязна расказаў, як трэба зараз будаваць работу первічным партыйным арганізацыям, каб забяспечыць бліскучую перамогу стаўленскага блока камуністаў і беспартыйных на выборах у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.

Г. Паўлаў.

НА ТЭМЫ ДНЯ

Аб'ядзённа клапаціцца аб бытавым абслугоўванні насельніцтва

У Брэсце налічваецца значная колькасць устаноў па бытавому абслугоўванню насельніцтва. Але ўсе яны па-сапраўднаму абслугоўваюць працоўных горада. Характэрным з'яўляецца работа мясцовых і краёвых арцелаў сістэмы аблмногапромсаюза і аблпінсаюза. З іх яны працуюць у тых гадзінах ў якія працуюць і прадпрыемствы і установы горада. Шавецкая арцель „17 верасня" працуе з 9 да 18 гадзін, арцелі хімічнай чысткі, прачашкі „Гігіена" і швейная „Новы шлях" таксама працуюць з 9 да 18 гадзін.

Такім чынам напрашваецца вывад: калі ж рабочаму і служачаму здаць у рамонт свой абутак, зрабіць заказ на шыццё палто, шубы і іншай вопраткі, альбо здаць у чыстку і мыццё адзежы? Гэтае пытанне кіраўнікі арцеляў адказваюць: „Нахай здаюць нам у выхадны дзень".

Безумоўна ў выхадны дзень і рабочыя і служачыя не могуць быць абслужаны і к таму ўсе майстэрні ў агульнавыходны дзень адкрыты.

У горадзе ёсць і „Амерыканкі" па рамонту абутку і вопраткі. Яны таксама працуюць у тыя ж дні і гадзіны, як і астатнія майстэрні. Нават ёсць такія „Амерыканкі", як № 1 па рамонту абутку, (якая змяшчаецца на вуліцы Перэца) сістэмы аблкаапінсаюза, якая прымае заказы толькі з 11 да 13 гадзін.

Даволі важным з'яўляецца такая установа, як радыёвузел. Сотні рабочых і служачых жадаюць правесці сабе на кватэру радыё, каб слухаць розныя лекцыі, перадачы апошніх паведамленняў з Масквы і Мінска, канцэрты і г. д. На жаль, кіраўнікі Брэсцкай тэлефонна-тэлеграфнай канторы не хочуць гэтага зразумець. Для таго, каб правесці радыё, з пачатку трэба напісаць заяву радыёвузлу на атрыманне дазволу, затым — ісці на пошту і аплаціць кошт устаноўкі і абанементную плату за слуханне. А каса па прыёму грошай адкрыта толькі з 9 да 17,5 гадзін. У агульнавыходныя дні каса не прымае грошай. Такім чынам рабочыя і служачыя пазбаўлены магчымасці ўстанавіць у сабе радыёкропкі.

З такім становішчам трэба пакончыць. Работай бытавых устаноў неабходна заняцца гарадскому выканаўчаму камітэту і прымусіць кіраўнікоў аблмногапромсаюза і аблкаапінсаюза змяніць гадзіны работы прыёмачных пунктаў мясцовага значэння па бытавому абслугоўванню працоўных, прадаставіць магчымасць рабочым і служачым карыстацца паслугамі гэтых устаноў.

Вайна ў Афрыцы

ЛОНДАН, 12 лістапада. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, англійскія войскі, якія дзейнічаюць са стараны Галабата (Англа-Егіпецкі Судан), нанеслі ўчора цяжкія страты праціўніку. У выніку працягваўшагася ўвесь дзень паспяховага артылерыйскага абстрэлу ваенных аб'ектаў праціўніка ў Метэма загарэліся нафтасховішчы і харчовыя склады.

У сектары Касала аперацыі прадаўжаюцца.

На франтах у Егіпце, Кеніі і Палестыне не адбылося ніякіх змен.

РЫМ, 12 лістапада. (ТАСС). Італьянскае камандванне паведамляе: „У Паўночнай Афрыцы матарызаваныя часці праціўніка былі прымушаны ўцякаць нашымі матарызаванымі войскамі. У зоне Алам эль Матшы (на паўднёвы ўсход ад Сідзі-Барані). Нашы паветраныя злучэнні паспяхова бамбардыравалі аэрадром і чыгуначную станцыю Бург эль Араб (на паўднёвы захад ад Александрыі), аэрадром Маатэн Багуш, казарменныя баракі і непрыяцельскія збудаванні ў Мерса-Матрух.

Непрыяцельскія самалёты бамбардыравалі Дэрна, Бенгазі. У Дэрна пашкоджаны жылыя дамы, забіты два чалавекі і ранена 10, галоўным чынам сярод мусульманскіх дзяцей. У Бенгазі забіта 3 чалавекі і ранена 10.

Ва Усходняй Афрыцы былі адбіты паўторныя атакі непрыяцеля на Гаалабат".

Зводка Італьянскага камандвання

РЫМ, 12 лістапада. (ТАСС). Італьянскае камандванне паведамляе, што ў ноч на 10 лістапада ў цэнтральнай частцы Міжземнага мора італьянская падводная лодка атакавала буйныя англійскія ваенна-марскія сілы.

У ноч на 11 лістапада італьянскія падводныя лодкі патапілі 2 параходы, якія ішлі на ўсход у суправаджэнні буйнага канвоя.

У ноч на 12 лістапада непрыяцельскія самалёты атакавалі марскую базу Таранто. Сур'ёзна пашкоджан адзін італьянскі карабль. Афар няма. Збіта 6 непрыяцельскіх самалётаў. Частка іх экіпажа ўзята ў палон.

У Эпіры атакі праціўніка на Калабака адбіты. Італьянская авіяцыя зноў бамбардыравала ваенныя аб'екты Янівы, Мецавон, Касторы, Корфу, Ларысы і раён возера Прэспа. Усе італьянскія самалёты вярнуліся на свае базы.

Да землятрасення ў Румыніі

ЛОНДАН, 12 лістапада. (ТАСС) Як перадае агенцтва Рэйтэр з Сафіі, згодна апошніх весткі з Бухарэста, колькасць афіяр землятрасення ў Румыніі перавышае 10 тысяч чалавек. Акрамя небаскроба Карлтон, поўнасцю разбурана некалькі 8-паверхавых дамоў, пад абломкамі якіх пахавана звыш тысячы жыхароў. У 8 гадзін 35 мінут раніцы 11 лістапада адчуваўся новы падземны штурмок. Атрыманыя да гэтага часу весткі паказваюць, што вынікі другога землятрасення былі больш сур'ёзнымі, чым гэта меркавалася раней. Пацярпела звыш 10 буйных гарадоў, уключаючы Плоешці, Бузаў, Галац і Ясы, а таксама многа вёсак. Забіта некалькі сот чалавек. З-пад разбураных дамоў у дунайскім парту Галац выцягнута 30 трупаў і каля 100 раненых. У нафтаносным раёне закол Плоешці узнікла многа пажараў, для пагашэння якіх прыбылі ваенныя часці. 11 лістапада румынскі ўрад мабілізаваў усіх інжынераў, архітэктараў, урачоў, санітарных інспектараў і тэхнікаў.

ХРОНІКА

Соўнарком СССР назначыў тав. Почэмкава К. І. намеснікам Народнага Камісара Вугальнай Прамысловасці.

(ТАСС).

РАЗВЯДЗЕННЕ КОК-САГЫЗА Ў ТАТАРЫІ

У Татарыі плантацыі кок-сагыза займаюць 2 тысячы гектараў. Многія калгасы добра асвоілі тэхніку вырашчвання гэтай каштоўнай каўчуканосной расліны і здымаюць высокія ўраджаі. Сельгаскарцель „Спартак", Шугураўскага раёна, сабрала ў мінулым годзе па 10 кілограмаў насення з 14 цэнтнераў карэнняў з кожнага гектара. Тут атрымоўваюць ад кок-сагыза каля 23 тысяч рублёў даходу. Калгас „Канл шушма" таго-ж раёна сабраў па 43 кілограмы насення з гектара на 2-х гадовых плантацыях. (ТАСС).

Англа-германская вайна

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 12 лістапада. (ТАСС) Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора ў другой палавіне дня некалькі адзіночных германскіх самалётаў зрабілі налёт на раён Лондана, а таксама па некаторыя ўнутраныя графствы Англіі і скінулі невялікую колькасць бомб. Бамбардыроўка прычыніла незначныя матэрыяльныя страты. Чалавечыя афіяры невялікія.

Указваецца, што налёт германскай авіяцыі, які меў месца ў ноч на 12 лістапада, з'яўляецца адным з найбольш кароткіх начных налётаў на Лондан з часу пачатку масавых аперацый германскай авіяцыі супроць Англіі.

У ноч на 11 лістапада англійскія самалёты бамбардыравалі шматлікія аб'екты праціўніка, у тым ліку нафтазаводы ў Гельзенкірхене, Рэйнскай вобласці і Бремене, прадпрыемствы ў Эсене (заводы Крупа), Мангейме і Амстэрдаме (авіяцыйныя заводы Фоккер) і Дрэздэне. Акрамя таго, англійскія самалёты скінулі бомбы на судны ў Дунбургу, на марскія парты Лорыян, Шэрбург, Гаўр, Дэнкерк, Флісінген і чыгуначныя вузлы ў Дэсаўе, Мюнстэры, Мангейме і Дрэздэне, а таксама на 14 аэрадромаў у Германіі і на акупіраванай ёю тэрыторыі.

У часе дзённых аперацый 10 лістапада англійскія самалёты атакавалі судны ў Булоні і Кале. З усіх гэтых аперацый не вярнуліся 5 англійскіх самалётаў.

Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што 10 лістапада англійскія самалёты бамбардыравалі доки ў Санці-Кварантэ, якія былі сур'ёзна пашкоджаны. Паспяховы налёт зроблен таксама на Канісполіс, дзе падвергліся бамбардыроўцы дамба і камунікацыі. Усе англійскія самалёты шчасліва вярнуліся на сваю базу.

З авіяносца „Арк Ройял" англійскія самалёты падвергілі бамбардыроўцы гавань і аэрадром у Кальяры (Сардынія). На намечаную цель скінута многа бомб, якія выклікалі ўзрывы і пажары. Збіта 2 непрыяцельскіх самалёты. Англійская авіяцыя не панесла ніякіх страт.

На працягу тыдня, які закончыўся 9 лістапада, у часе паветраных сражэнняў над Англіяй збіта 47 германскіх самалётаў. Англійская авіяцыя за гэты-ж час страціла 21 самалёт.

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 12 лістапада. (ТАСС). Вярхоўнае камандванне германскай арміі паведамляе, што ў выніку налётаў германскіх бамбардыроўшчыкаў на Лондан у ноч на 11 лістапада ўзніклі вялікія пажары на чыгуначных збудаваннях на поўнач ад Уормвуда і Скрабса, а таксама ў Уілдэн, Харлдэн, Саут-Эктон, у Лайтоне, Бермондсі і на авіяцыйным заводзе каля Бірмінгама. Некалькі бомб буйнага калібру ўпала на вялікі газавы завод. Не гледзячы на несрыяючыя метэаралагічныя ўмовы, 11 лістапада германскія бамбардыроўшчыкі працягвалі атакаваць Лондан. Таксама многія прадпрыемствы ваеннай прамысловасці Паўднёвай і Цэнтральнай Англіі. Цяжка пашкоджан завод авіяцыйных матораў каля Слау, газавы завод і прамысловыя збудаванні ля Бірмінгама, ваенны завод каля Оксфорда і мост у Фольстоне.

На паўднёвы ўсход ад Гарвіча германскай авіяцыяй патоплена 7 гандлёвых параходаў агульным танажам каля 44 тысяч тон і пашкоджана 5 другіх суднаў.

Германскія гідрасамалёты скінулі бомбы на 2 англійскія гандлёвыя судны агульным танажам у 14 тысяч тон.

У ноч на 12 лістапада праціўнік не прадпрымаў налётаў на тэрыторыю Германіі. 11 лістапада італьянская авіяцыя паспяхова бамбардыравала адзін з партоў усходняга ўзбярэжжа Англіі. Праціўнік страціў учора 22 самалёты. 7 германскіх і 6 італьянскіх самалётаў загінулі без весткі.

ВАЙНА ПАМІЖ ГРЭЦЫЯЙ І ІТАЛІЯЙ

БІТОЛЬ, 12 лістапада. (ТАСС) Пасля некалькіх дзён зацішша ў раёне Вігліста-Крыталопіге ўчора вечарам пачалося наступленне італьянскіх войск на грэчаскія пазіцыі. Грэкі былі адцэсёны.

Сёння раніцой пачаліся дзеянні авіяцыі. Італьянская авіяцыя бамбардыравала грэчаскі тыл. Англійскія самалёты бамбардыравалі тыл італьянскіх войск. Па атрыманых данных, наступленне італьянцаў адбываецца паспяхова. Альпійская дывізія, якая дзейнічае супроць грэкаў, высадзілася ў парту Санці-Кварантэ.

НЬЮ-ЙОРК, 12 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, італьянскія войскі абстрэлялі артылерыйскім агнём грэчаскія злучэнні і ўмацаваныя пазіцыі на паўднёвым склоне гары Марова. Пасля артылерыйскай падрыхтоўкі італьянскія часці атакавалі і занялі некалькі важных горных пазіцый, прымусіўшы грэкаў адступіць у некалькіх пунктах.

Грэчаскія войскі адбілі італьянскае наступленне ў раёне ракі Каламас у кірунку Піраміцця. Некалькі тысяч італьянскіх ваенапалонных прыбыла 10 лістапада ў Яніну. 600 італьянскіх ваенапалонных накіравана ў Салонікі.

Грэчаскае радыё паведамляе, што грэчаскія войскі працягваюць праследаваць італьянцаў у раёне гор Пінд. Захвачана многа палонных, вялікая колькасць ваенных матэрыялаў. У раёне ракі Каламас італьянцы вымушаны былі адступіць. Англійскія самалёты падпалілі нафтасховішчы ў Валоне. У парту Санці-Кварантэ пашкоджан італьянскі ваенны карабль. Англійскія самалёты бамбардыравалі верфі ў Канісполісе.

БЕЛГРАД, 12 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню газеты „Палітыка", англійскія самалёты бамбардыравалі гарады на поўдні Італіі і парты ў Албаніі, у якіх адбываецца высадка італьянскіх войск. Аб'яднаныя грэка-англійскія паветраныя сілы бамбардыравалі таксама дарогі, якія звязваюць фронт з тылам.

Ад'езд генерала Антанеску ў Рым

БУХАРЭСТ, 12 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе Румынскае тэлеграфнае агенцтва, румынскі прэм'ер-міністр генерал Антанеску па запрашэнню Мусаліні выязджае сёння вечарам у Рым. Антанеску будуць суправаджаць міністр замежных спраў Стурдзэ, статс-сакратар па справах прэсы і прапаганды Кодгант, намеснік міністра фінансаў Папаначе і іншыя.



Германская цяжкая зенітная гармата.
Фота ТАСС

Агенцтва Рэйтэр аб колькасці беспрацоўных у Англіі

ЛОНДАН, 12 лістапада (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае паведамленне англійскага міністэрства працы і нацыянальнай павіннасці, у якім гаворыцца, што на 1 кастрычніка ў Англіі было зарэгістравана 339.936 беспрацоўных мужчын і 301. 346 жанчын.

Афіцыяльнае паведамленне аб заняцці Лібрэвіля

НЬЮ-ЙОРК, 12-га лістапада (ТАСС). Па паведамленню карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Вішы, там афіцыяльна абвешчана, што войскі генерала дэ Голя занялі Лібрэвіль (Французская Экватарыяльная Афрыка).

Паведамленне камандвання генерала дэ Голя

ЛОНДАН, 12 лістапада. (ТАСС) Агенцтва Рэйтэр перадае, што камандванне генерала дэ Голя апублікавала наступнае камунікат: „Гарнізон Лібрэвіля прыняў умовы афіцэра, які камандуе войскамі генерала дэ Голя, аб спыненні ваенных дзеянняў. Камендуючы гарнізонам здаўся 10 лістапада ў 4 гадзіны 30 мінут. Ваенныя караблі дэ Голя „Саворэйян" і „Браза" і „Камандан Довіен" увайшлі ў порт Лібрэвіля".

Ваенныя дзеянні ў Кітаі

У Цэнтральным Кітаі. У провінцыі Хубэй адбываюцца дробныя сутычкі і артылерыйская перастрэлка ў раёне Ічана. Перадавыя лініі кітайскіх войск знаходзяцца на адлегласці адной кілометра ад Ічана.

У правінцыі Анхуэй кітайцы патапілі 7 лістапада японскую кананерку, якая ішла па рацэ Яцзы, а 9 лістапада — японскі транспарт з харчаваннем і боепрыпасамі.

Кітайскія партызаны заняли некалькі пунктаў вакол Сучжоу (на паўночны захад ад Шанхая).

У Паўночным Кітаі. У провінцыі Хэбэй кітайцы разгарнулі баявыя аперацыі на паўночны ўсход ад Бэйпіна. Працягваюцца мясцовыя сутычкі паміж кітайскімі і японскімі войскамі ў ўсходняй частцы правінцыі Шансдун.

У Паўднёвым Кітаі. У паўднёва-заходняй частцы правінцыі Гуандун незначныя бои адбываюцца каля Цзяньчжоу.

12 лістапада (ТАСС).

Адказны рэдактар Г. Т. МІНЧУКОЎ

Брэсцкі Дарожна-Механічны Тэхнікум Галоўдорупра пры СНК БССР

АБ'ЯЎЛЯЕ

дадатковы прыём студэнтаў на І-ы і ІІ-і курсы

ТЭХНІКУМ РЫХТУЕ:

1) тэхнікаў-дарожнікаў па будаўніцтву аўтамабільных дарог і мастоў,
2) тэхнікаў-механікаў па эксплуатацыі і рамонту дарожных машын, трактараў і аўтамабіляў.

Студэнты абодвух спецыяльнасцей навучаюцца валодзенню аўтамабілем і трактарам. На іспыты з'яўляцца ў тэхнікум толькі па выкліку. Плата за абучэнне не бярэцца. Асобы скончыўшыя сярэднюю школу, а таксама скончыўшыя семігодку з выдатнымі адзнакамі па асноўных прадметах прымаюцца на першы курс без іспытаў.

На стыпендыю залічваюцца студэнты прынятыя ў тэхнікум без іспытаў, як выдатнікі сярэдняй школы, а таксама атрымаўшыя на іспытах не менш дзве трэці выдатных адзнак, астатнія не ніжэй як добра.

Іншагародніх забяспечваюцца кватэрамі.

Прыёмныя іспыты з 18 да 24 лістапада.

Заявы падаваць на імя дырэктара тэхнікума.

Да заявы аб паступленні неабходна прыкласці наступныя дакументы:

1) пасведчанне аб асвеце (арыгінал) 2) аўтабіяграфію 3) пасведчанне аб нараджэнні, 4) даведку аб стане здароўя 5) три фотакарткі [illegible] штовых марак на 60 кап.

АДРАС: г. Брэст вул. Дзяржынскага [illegible] дарожны тэхнікум.

[illegible] КЦЫЯ.

СЕННЯ Ў КІНОТЭАТРАХ

Кінатэатр „1-га МАЯ"
МУЗЫКАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Кінатэатр імені Горкага
АГНІ ВЯЛІКАГА ГОРАДА

Дзіцячаму дому № 2
г. Брэст, вул. Маскоўская 2
ПАТРАБУЮЦЦА
на пастаянную работу:
Прачкі,
Начны вартаўнік,
Дворнік-істопнік,
Начная няня,
Прыбіральшчыцы.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Гарадскому здраўаддзелу
патрабуецца
бухгалтар.